# Выступленне намесніка Міністра культуры Т.І. Стружэцкага на сумесным пасяджэнні калегій Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі «Аб правядзенні эксперымента па аб'яднанні сельскіх публічных і школьных бібліятэк»

За апошнія дзесяцігоддзі ў краіне сфарміравалася сетка публічных і спецыяльных бібліятэк – **каля 9,3 тыс. адзінак з аб'ёмам сукупнага фонду звыш 200 млн экз.** дакументаў, якая ў асноўным задавальняе запатрабаванні ўсіх катэгорый насельніцтва ў бібліятэчным абслугоўванні.

Аснову бібліятэчнай сістэмы складаюць бібліятэкі сістэмы Міністэрства культуры (42% ад агульнай колькасці бібліятэк) і Міністэрства адукацыі (41%).

*Сетка дзяржаўных бібліятэк Міністэрства культуры на 01.01.2012 склала 3701 бібліятэку, у ліку якіх: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 6 абласных універсальных бібліятэк, 132 цэнтральныя раённыя і гарадскія бібліятэкі.*

Згодна са статыстыкай, амаль кожны другі жыхар Беларусі з'яўляецца карыстальнікам публічных бібліятэк. На 2,4 тыс. жыхароў прыпадае адна публічная бібліятэка, што практычна адпавядае нарматывам ІФЛА (ЮНЕСКА). Застаецца стабільным працэнт ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем (у межах 38%).

***На 01.01.2012 сукупны фонд публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры склаў звыш 58 млн экз.***

*Бібліятэчныя фонды размеркаваны наступным чынам: сельскія бібліятэкі валодаюць звыш 60% агульнага аб'ёму, у абласных бібліятэках сканцэнтравана звыш 8%.*

**У сярэднім па рэспубліцы на адну дзяржаўную публічную бібліятэку прыходзіцца 15,3 тыс. дакументаў.**

У сукупным аб'ёме фонду дакументы на традыцыйных друкаваных носьбітах складаюць 99%. Кнігі складаюць 86% ад агульнай колькасці бібліятэчных дакументаў (пры гэтым больш паловы кніг – мастацкая літаратура), 12% – перыядычныя выданні (газеты і часопісы), 0,7% – аўдыёвізуальныя і электронныя выданні, 1% – іншыя віды дакументаў.

**Літаратура на беларускай мове займае каля 25% ад агульнага аб'ёму бібліятэчных фондаў.**

За апошнія гады актыўна праводзілася **камп'ютарызацыя бібліятэк** – на сённяшні дзень камп'ютарызавана 48% дзяржаўных публічных бібліятэк, у тым ліку ўсе абласныя, цэнтральныя гарадскія і раённыя бібліятэкі, а таксама 64% дзіцячых бібліятэк. Маюць выхад у Інтэрнэт 31% публічных бібліятэк, электронную пошту – 1108 (29%).

У Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка, якая прызвана забяспечыць захаванне сеткі публічных бібліятэк, інфарматызацыю галіны, удасканаленне камплектавання бібліятэчных фондаў.

Так, камплектаванне фондаў дзяржаўных публічных бібліятэк ажыццяўляецца ў адпаведнасці з шэрагам даручэнняў Прэзідэнта і Урада Рэспублікі Беларусь, у тым ліку па:

– вылучэнні на камплектаванне бібліятэчных фондаў не меней 15% сродкаў з мясцовых бюджэтаў, якія выдаткоўваюцца на ўтрыманне бібліятэк;

– паляпшэнні камплектавання фондаў бібліятэк выданнямі, якія выпускаюцца ў рамках дзяржзаказу;

– наданні бібліятэкам права закупляць сацыяльна значныя выданні напрамую ў выдавецтвах і праз абласныя кнігагандлёвыя прадпрыемствы з аплатай паслуг па камплектаванні і дастаўцы на месцы па дамоўленасці бакоў, але не больш за 10% ад сумы заказу і інш.

Сёння вядзецца прапрацоўка задачы па ўдасканаленні камплектавання фондаў публічных бібліятэк, у тым ліку з прыцягненнем прадстаўнікоў бізнэсграмадскасці, пастаўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнкам пры звароце з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнаму сходу.

*Даведачна: Пералік даручэнняў, накіраваных на паляпшэнне камплектавання фондаў публічных бібліятэк:*

*ад 26 верасня 2005 г. аб паляпшэнні камплектавання фондаў бібліятэк выданнямі, якія выпускаюцца ў рамках дзяржзаказу;*

*ад 7 чэрвеня 2006 г. № 10/120-59 ДСП аб узаемадзеянні з грамадскім аб'яднаннем «Саюз пісьменнікаў Беларусі» па паляпшэнні камплектавання фондаў публічных бібліятэк сацыяльна значнымі выданнямі і выданнямі твораў беларускіх пісьменнікаў, якія карыстаюцца попытам у чытачоў;*

*ад 23 лютага 2007 г. № 10/48 аб вылучэнні не менш, чым 15% сродкаў з мясцовых бюджэтаў, якія выдаткоўваюцца на ўтрыманне бібліятэк;*

*ад 14 лютага 2008 г. № 10/124-161, 124-170, 207-17, 540-9, 710-25 П145 аб наданні бібліятэкам права закупляць сацыяльна значныя выданні напрамую ў выдавецтвах і праз абласныя кнігагандлёвыя прадпрыемствы з аплатай паслуг па камплектаванні і дастаўцы на месцы па дамоўленасці бакоў, але не больш за 10% ад сумы заказу;*

*ад 29 лістапада 2008 г. № 11/512-73 аб уключэнні ў спіс сацыяльна значных выданняў і камплектаванні фондаў публічных бібліятэк выданнямі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь;*

*ад 13 лютага 2009 г. № 05/1536-1, 13 мая 2009 г. № 05/209-170, 206-136, ад 11 снежня 2009 г. № 05/206-406 аб камплектаванні фондаў выданнямі Выдавецтва Беларускага Экзархата;*

*ад 14 чэрвеня 2012 г. № 9 аб удасканаленні камплектавання фондаў публічных бібліятэк, у тым ліку з прыцягненнем да гэтай працы прадстаўнікоў бізнесграмадства.*

Стратэгічныя задачы дзяржаўнай палітыкі ў вобласці бібліятэчнай справы, арыентаваныя на забеспячэнне публічнымі бібліятэкамі канстытуцыйнага права грамадзян на вольны і роўны доступ да інфармацыі, пакладзены ў аснову Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады.

У дадзеную праграму ўключаны мерапрыемствы, накіраваныя на:

– камп'ютарызацыю бібліятэк і падключэнне іх да сеткі Інтэрнэт;

– набыццё і мадэрнізацыю камп'ютарнай тэхнікі, сервернага абсталявання, тыфлаабсталявання для карыстальнікаў з парушэннем зроку;

– забеспячэнне доступу карыстальнікам бібліятэк да электронных інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку электронных выданняў і баз даных;

– рэканструкцыю і капітальны рамонт бібліятэчных будынкаў і інш.

Рэалізацыя мерапрыемстваў Праграмы прывядзе да:

– абнаўлення фондаў публічных бібліятэк (5% штогод);

– павелічэння колькасці наведванняў, у тым ліку аддаленых карыстальнікаў (на 5% да 2015 года);

– поўную камп'ютарызацыю бібліятэк з падключэннем іх да сеткі Інтэрнэт і арганізацыяй электроннай пошты (з улікам абнаўлення камп'ютарнага парку (20% у год);

– рэканструкцыі і рамонту 147 будынкаў цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэк.

Таксама на дзяржаўным узроўні з удзелам іншых зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў вырашаецца задача па **стварэнні Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі**.

Асаблівая ўвага дзяржавы скіравана на арганізацыю бібліятэчнага абслугоўвання сельскага насельніцтва.

Варта адзначыць, што ў сельскай мясцовасці сканцэнтравана асноўная частка публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры – 82% ад агульнай колькасці дзяржаўных публічных бібліятэк.

Пра запатрабаванасць паслуг публічных сельскіх бібліятэк сведчыць той факт, што (паводле статыстыкі) працэнт ахопу сельскага насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем традыцыйна вышэй, чым у цэлым па рэспубліцы (ад 40 да 50%).

*У сельскіх бібліятэках сканцэнтравана 39% кадравага саставу публічных бібліятэк, з іх 19% складаюць спецыялісты з вышэйшай адукацыяй (у 2009 г. спецыялісты сельскіх бібліятэк, што маюць вышэйшую адукацыю, склалі ўсяго 10%).*

Значная падтрымка сельскім бібліятэкам была аказана ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Адраджэнне і развіццё сяла» на 2005–2011 гг., у межах якой яны, атрымаўшы **статус бібліятэкі аграгарадка**, змаглі значна ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу. Наяўнасць у аграгарадку не менш адной бібліятэкі рэгламентуецца пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па ўкараненні сістэмы дзяржаўных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі» ад 30 мая 2003 г. № 724.

**На 01.01.2012 у рэспубліцы функцыянуе 1494 бібліятэкі аграгарадкоў. Звыш 81% з іх камп'ютарызавана.**

У Дзяржаўнай праграме ўстойлівага развіцця сяла на 2011–2015 гг. таксама рэалізуецца комплекс мер, скіраваных на падтрымку сельскіх бібліятэк, іх развіццё як бібліятэчна-інфармацыйных, сацыяльна-культурных цэнтраў сельскіх населеных пунктаў.

Аднак, адмоўная дынаміка дэмаграфічных паказчыкаў (штогод колькасць сельскіх жыхароў скарачаецца ў сярэднім на 2%), а таксама міграцыйныя працэсы (адток жыхароў, у першую чаргу моладзі, у гарады) прыводзяць да вымушанага закрыцця ўстаноў сацыяльна-культурнай і адукацыйнай сферы, утрыманне якіх таксама становіцца эканамічна немэтазгодным. Так, за апошнія 10 гадоў у сельскіх маланаселеных пунктах была зачынена кожная чацвёртая сельская бібліятэка (толькі за 2011 г. іх колькасць скарацілася на 109 адзінак).

Для забеспячэння жыхароў сяла бібліятэчным абслугоўваннем на 01.01.2012 **функцыянавала 90 бібліёбусаў**. Ствараюцца таксама ўстановы культуры змешанага тыпу (бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-музеі і інш.), якіх па краіне налічваецца каля 525 адзінак.

Адным з магчымых шляхоў аптымізацыі інфраструктуры сацыяльнай сферы сяла з'яўляецца **інтэграцыя сельскіх публічных і школьных бібліятэк**. Агульная мэта працы публічнай і школьнай бібліятэкі (бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва), а таксама **блізкае функцыянальнае прызначэнне** (прадастаўленне доступу да інфармацыі) дазваляюць разглядаць дадзены варыянт аб'яднання як адзін з найболей аптымальных.

Мэтай эксперымента, які праводзяць па даручэнню Урада Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі сумесна з аблвыканкамамі, з'яўляецца стварэнне інтэграваных бібліятэк на базе школьных або публічных бібліятэк з улікам сітуацыі ў канкрэтным населеным пункце.

Падчас эксперымента планавалася прааналізаваць эканамічны эфект, прапрацаваць пытанні камплектавання бібліятэчных фондаў, матэрыяльна-тэхнічнага і кадравага забеспячэння, нарматыўна-прававой базы.

Варта адзначыць, што ў Рэспубліцы Беларусь пытанне аб аптымізацыі бібліятэчнага абслугоўвання сельскага насельніцтва шляхам аб'яднання сельскіх публічных і школьных бібліятэк неаднаразова разглядалася і раней (у 1992–1995 гг.). Эксперыментальнае аб'яднанне сельскіх публічных і школьных бібліятэк ажыццяўлялася ў шасці раёнах Мінскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей. У 2010–2011 гг. аб'яднанне бібліятэк у чатырох населеных пунктах адбылося ў Барысаўскім раёне Мінскай вобласці. У Гомельскай вобласці ў рамках праграмы па аптымізацыі функцыянавання ўстаноў сацыяльнай сферы ў сельскай мясцовасці да работы па інтэграцыі сельскіх публічных і школьных бібліятэк прыступілі ў 2009 г. Разам з тым, канчатковыя вынікі эксперымента і неабходныя рашэнні не былі прыняты.

Улічваючы ўжо назапашаны вопыт па аб'яднанні бібліятэк у сельскай мясцовасці, з боку Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі было рэкамендавана:

– пры вызначэнні населенага пункта ў першую чаргу ўлічваць колькасны склад насельніцтва зоны бібліятэчнага абслугоўвання, **аддаючы прыярытэт маланаселеным пунктам**. Пры гэтым адзначалася, што ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па ўкараненні сістэмы дзяржаўных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі» ў кожным аграгарадку павінна быць не меней адной публічнай бібліятэкі;

– пры выбары будынка або памяшкання для аб'яднанай бібліятэкі асаблівую ўвагу надаваць стану матэрыяльна-тэхнічнай базы, іх адпаведнасці санітарным нормам і пажарнай бяспецы, а таксама **агульнадаступнасці бібліятэкі** (максімальная блізкасць да месца пражывання асноўнай часткі жыхароў населенага пункта, а таксама іншых устаноў сацыякультурнай сферы, у прыватнасці да школы, **наяўнасць ці магчымасць стварэння асобнага ўваходу**;

– для забеспячэння даступнасці бібліятэчных паслуг для насельніцтва рэкамендавалася ўсталяваць зручны для яго графік працы, які б не супярэчыў арганізацыі адукацыйнага працэсу;

– перад аб'яднаннем бібліятэчных фондаў правесці іх аналіз з мэтай выключэння дэфектных і састарэлых па змесце дакументаў. Перадачу фонду з балансу аднаго з аддзелаў раённага выканаўчага камітэта (культуры ці адукацыі) ажыццяўляць на аснове рашэння камісіі ў складзе прадстаўнікоў аддзелаў культуры і адукацыі. **Фонд навучальных выданняў (у тым ліку і кнігі серыі «Школьная бібліятэка») рэкамендавалася пакідаць у школе на балансе аддзела адукацыі.**

З боку Міністэрства культуры таксама рэкамендавалася захаваць аб'яднаную бібліятэку ў **якасці філіяла сеткі публічных бібліятэк**.

Выкананне дадзенай рэкамендацыі дазваляла захаваць перавагу **цэнтралізацыі публічных бібліятэк**, што існуе, дзякуючы якой эфектыўнасць бібліятэчнага абслугоўвання дасягаецца за кошт **наяўнасці ў бібліятэчнай сетцы адзінага фонду, ажыццяўлення цэнтралізаваных працэсаў камплектавання і апрацоўкі літаратуры, аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў** і інш.

*Даведачна: Дадзеныя рэкамендацыі Міністэрствы культуры былі таксама распрацаваны з улікам вопыту па аб'яднанні сельскіх публічных і школьных бібліятэк у суседніх краінах – Расіі (Бранская вобласць) і Украіне (Роўненская вобласць).*

Варта адзначыць, што ў большасці рэгіёнаў ведамасная раз'яднанасць была пераадолена, мясцовымі органамі выканаўчай улады прыняты абгрунтаваныя рашэнні па правядзенні эксперыменту з улікам вышэйназваных рэкамендацый. Гэтаму спрыяла таксама правядзенне ў Міністэрстве культуры спецыяльнай нарады з усімі зацікаўленымі.

У эксперыменце прынялі ўдзел усе вобласці, былі задзейнічаны 62 населеныя пункты ў 22 раёнах:

*Брэсцкай вобласці – 16 населеных пунктаў у 2 раёнах;*
*Віцебскай – 3 населеных пункта ў 1 раёне;*
*Гомельскай – 36 населеных пунктаў у 14 раёнах;*
*Гродзенскай – 2 населеных пункта ў 1 раёне;*
*Мінскай – 3 населеных пункта ў 2 раёнах;*
*Магілёўскай – 2 населеных пункта ў 2 раёнах.*

Усяго ў эксперыменце прынялі ўдзел 124 бібліятэкі: 62 публічныя (2% ад агульнай колькасці сельскіх публічных бібліятэк) і 62 школьныя (3% ад агульнай колькасці школьных бібліятэк, размешчаных у сельскай мясцовасці).

Пры выбары ведамаснай падпарадкаванасці аб'яднанай бібліятэкі мясцовымі органамі ўлады ў пераважнай большасці выпадкаў была вызначана галіна культуры.

*Так, з 124 бібліятэк, якія прынялі ўдзел у эксперыменце, у падначаленне аддзела адукацыі перайшла толькі адна бібліятэка ў аграгарадку Орля Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці.*

Неабходна адзначыць, што ў дадзеным выпадку па прычыне непрадуманых дзеянняў з боку мясцовых органаў выканаўчай улады мае месца парушэнне сацыяльнага стандарту, паводле якога ў кожным аграгарадку павінна быць не менш, чым адна публічная бібліятэка.

Асноўныя пытанні аб'яднання знайшлі адлюстраванне ў арганізацыйна-распарадчых і іншых дакументах раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама распрацаваных у шэрагу рэгіёнаў лакальных нарматыўных прававых актах. У якасці прыкладу можна прывесці рашэнне Дзяржынскага райвыканкама.

Шэраг адрозненняў у прынятых рашэннях па дадзеных пытаннях дазваляе канстатаваць наяўнасць некалькіх мадэляў/схем аб'яднання.

Так, на базе арганізацый культуры было змешчана 46 аб'яднаных бібліятэк (з іх 35 бібліятэк маюць асобныя будынкі, 11 размяшчаюцца ў клубных установах).

18 аб'яднаных бібліятэк размешчана ў будынках, што знаходзяцца на балансе аддзелаў адукацыі, у тым ліку: 17 – у школе, 1 – у дзіцячым садзе.

Таксама адна аб'яднаная бібліятэка функцыянуе ў будынку сельскага савета і адна – камбіната бытавых паслуг.

У Барысаўскім раёне, у якім інтэграцыя бібліятэк праводзілася некалькі гадоў назад, для базы аб'яднанай бібліятэкі былі выбраны будынкі як устаноў адукацыі, так і ўстаноў культуры. Галоўным крытэрыем стала матэрыяльна-тэхнічная база. Сёння там даволі паспяхова функцыянуюць 4 аб'яднаныя бібліятэкі.

Перад перадачай фондаў школьных бібліятэк у публічныя адбылася іх зверка, а таксама выключэнне дублетных, дэфектных, састарэлых па змесце дакументаў.

Аб'яднанне бібліятэчных фондаў у большасці выпадкаў ажыццяўлялася шляхам бязвыплатнай перадачы фондаў з балансу аддзелаў адукацыі на баланс аддзелаў культуры адпаведных раённых выканаўчых камітэтаў. Далейшае камплектаванне інтэграваных бібліятэк плануецца ажыццяўляць за кошт галіны «культура».

У адносінах да перадачы вучэбных выданняў ва ўсіх абласцях выпрацаваны адзіны падыход. Для забеспячэння адукацыйнага працэсу дадзеныя выданні мэтазгодна пакідаць у школе (на балансе аддзелаў адукацыі).

Патрабуе дадатковай прапрацоўкі падыход да правядзення эксперыменту, абраны ў Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці. У дадзеным рэгіёне ў чатырох населеных пунктах «аб'яднанне» 8 бібліятэк (4 публічных і 4 школьных) носіць хутчэй умоўны характар. Абраны шлях «аб'яднання» складаецца ў скарачэнні ставак бібліятэкараў (па 0,5 стаўкі ў школьнай і публічнай бібліятэках, а таксама сумяшчэнні рэжыму іх працы (школьная бібліятэка функцыянуе ў першую палову дня, публічная – у пасляабедзенны і вячэрні час). У дадзеным выпадку створаныя ўмовы абслугоўвання не забяспечваюць рэалізацыю **асноўнага прынцыпу працы публічнай бібліятэкі – агульнадаступнасці.**

У цэлым, улічваючы невялікі тэрмін работы аб'яднаных бібліятэк (у сярэднім 2–3 месяцы), наяўнасць варыятыўнасці ў мадэлях аб'яднання, канстатаваць яго вынікі у поўным аб'ёме рана. Таксама немагчыма зрабіць дакладны разлік эканоміі сродкаў ад праведзенага аб'яднання. **Разам з тым, эканамічны эфект эксперымента відавочны.**

Эканомія бюджэтных сродкаў у выніку эксперымента дасягаецца за кошт скарачэння:

– аб'ёмаў фінансавых сродкаў на камплектаванне фондаў (за кошт выключэння дубліравання літаратуры);

– выдаткаў на заработную плату (пры скарачэнні ставак);

– выдаткаў на ўтрыманне будынкаў, што знаходзяцца ў дрэнным стане (капітальны і бягучы рамонт), камунальныя плацяжы).

Так, напрыклад, пры найбольш распаўсюджаным варыянце аб'яднання скарачэнні расходаў на ўтрыманне будынка складаюць прыкладна 5–7 млн, аплату 0,5 стаўкі школьнага бібліятэкара – 12 млн, камплектаванне «невучэбнай» літаратурай – 5–6 млн. У выніку эканомія бюджэтных сродкаў за год можа скласці 25 і больш млн.

Пры ўзважаных падыходах на месцах, акрамя відавочнай эканамічнай выгады, удзельнікамі эксперыменту адзначаны шэраг іншых станоўчых момантаў аб'яднання бібліятэк:

– больш эфектыўна сталі выкарыстоўвацца будынкі/памяшканні;

– палепшана матэрыяльна-тэхнічная база абслугоўвання;

– аптымізаваны рэжым працы агульнадаступнай бібліятэкі;

– павялічылася якасць фонду (за кошт выключэння незапатрабаванай літаратуры, пашырэнні галіновага рэпертуару кніжнай часткі фонду і перыядычных выданняў);

– палепшаны кадравы склад спецыялістаў, якія забяспечваюць бібліятэчнае абслугоўванне;

– з'явіліся дадатковыя магчымасці ў цеснай узаемасувязі педагагічных работнікаў і спецыялістаў галіны культуры арганізоўваць шырокі спектр культурна-выхаваўчых мерапрыемстваў.

Такім чынам, у цэлым па рэспубліцы эксперымент адбыўся, а яго папярэднія вынікі сведчаць аб аптымізацыі бібліятэчнага абслугоўвання, карысці для чытачоў.

Далейшае функцыянаванне інтэграваных бібліятэк у першую чаргу залежыць ад мясцовых органаў кіравання, іх жадання падтрымліваць аб'яднаныя бібліятэкі і бібліятэчную справу ўвогуле.

У праект рашэння сумеснай калегіі ўключаны шэраг рэкамендацый, якія дазволяць завяршыць эксперымент і правесці паэтапную працу па аб'яднанні бібліятэк.